# УЛАДЗІМІРУ ПУЗЫНЮ - 70



**ПУЗЫНЯ** Уладзімір Якаўлевіч (н. 26.2. 1940, Менск), майстар-рэстаўратар нац. музычных інструментаў, выканаўца на іх, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1994). Скончыў Менскую музычную навучальню імя М. Глінкі (1964), Менскі інстытут культуры (1989). У 1965-78 артыст Дзяржаўнага нар. аркестра Беларусі імя Жыновіча, адначасова з 1972 працаваў у Менскім абласным, у рэспубліканскіх навукова-метадычных цэнтрах нар. творчасці і культурна-асветніцкай работы. З 1979 педагог-ілюстратар сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Бел. кансерваторыі, старшы метадыст па фальклоры пры Менскім абласным метадычным цэнтры. З 1982 майстар, у 1983-88 загадчык вучэбнай майстэрні па рэстаўрацыі, рамонце і вырабе нар. музычных інструментаў Менскага інстытута культуры. Стваральнік музея бел. музычных старажытных інструментаў «Бел. хатка». Вырабляе бел. нар. музычныя інструменты: аэрафоны сапранавыя, альтавыя, басовыя дудкі; жалейкі, дуды, трубы і інш.; хардафоны - колавая ліра, басэтля і інш. Выступае з ігрой на бел. музычных інструментах у канцэртных праграмах, фестывалях нар. творчасці і інш. Аўтар зб. «Лірнік» (1993), артыкулаў пра бел. нар. музычныя інструменты: «Беларуская дудка», «Беларуская жалейка», «Беларуская ліра», «Беларуская дуда», «Беларуская сурма», «Беларускія ўдарныя інструменты».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ